# КУЛЬТУРОЛОГИЯ

УДК 39: 688.72(=161.3)

## ПЕЦЯРБУРГСКІЯ КАЛЕКЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ЦАЦКІ

*С.У. КАСЦЮКЕВІЧ (Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*На падставе матэрыялаў, сабраных ў Расійскім этнаграфічным музеі, праводзіцца аналіз калекцый беларускай народной цацкі. Пададзена апісанне найбольш цікавых з этналагічнага погляду беларускіх народных цацак, гісторыі іх збірання.*

Расійскі этнаграфічны музей (РЭМ) - адзін з самых буйных музеяў Расіі. Ён заснаваны ў 1901 г. Музей з’яўляецца скарбніцай помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў Расіі, Беларусі, Украіны, Малдовы і іншых краін. У зборах музея каля 7 тыс. прадметаў і 3 тыс. фотаздымкаў з Беларусі [1]. Сярод экспанатаў сустракаюцца і цацкі з Беларусі. Пэўная частка збораў складзена з фондаў маскоўскага Музея народаў СССР, у калекцыях якога таксама былі беларускія народныя цацкі. Сярод цацак найболып шматлікая калекцыя лялек. Яна мае каля 800 лялек розных народаў [2]. Значную долю збораў драўлянай беларускай народнай цацкі Расійскага этнаграфічнага музея, датаваных кан. XIX - пач. XX ст., складаюць цацкі з Магілёўскай, Мінскай, Гродненскай губерняў.

Цікавымі, на наш погляд, з’яўляюцца цацкі, купленыя Е.Р. Раманавым у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні на сродкі Этнаграфічнага аддзела Рускага Музея Імператара Аляксанадра III у 1904 г. У склад дадзенай калекцыі ўваходзяць драўляныя цацкі-прылады для гульняў: «ваўчок», «салавей» (драўляны мяч), «пыж» («транпыж»), драўляныя «котелка» і «кралы», «крутора», «чыж», «пірагонь», «пілынчык» (назвы дадзены паводле рэгістрацыі ў кнізе паступленняў) [3]. Гэтыя цацкі былі спадарожнікамі дзіцячых гульняў нашых продкаў, па тэхналогіі вырабу яны дастаткова простыя, у асноўным зроблены з дрэва метадам тачэння. Тэхнічнае вырашэнне цацак уражвае прастатой і арыгінальнасцю, напрыклад, цацка з Магілёўскай губерні «ваўчок» [4] прадстаўляе тачоны з дрэва цыліндр на ножцы. Простая, паводле вырашэння, цацка «пагрэмушка» вытачана таксама на такарным станку. Пры патрэсванні цацкі атрымоўваецца своеасаблівы гук. Цацка трапіла ў Музей у 1930 г. з мястэчка Чавусы [5]. Нумары калекцый РЭМа, у якіх захоўваюцца цацкі з Беларусі, пералічаны ў тэматычным паказальніку. Аднак паказальнік не ўтрымлівае апісанняў цацак. У пералік уключаюцца наступныя раздзелы: «лялькі», «механічныя (рухомыя) цацкі, гульні і гульнёвы інвентар», «свістулькі», «цацачны інструмент, зброя і інш.» [6, с. 63 - 65]. Разам з тым, шэраг цацак можна сустрэць толькі ў калекцыях РЭМа. Іх дакладнае апісанне дапаможа сучасным майстрам-цацачнікам рэканструяваць старажытныя ўзоры цацак.

Наступная група цацак з Беларусі - механічныя цацкі з нескладанымі прыстасаваннямі для імітацыі нейкага працэсу, дзеяння, руху. Заслугоўвае ўвагі цікавая механічная цацка «пілавальшчык» з Магілёўшчыны. У цаццы схематычна прадстаўлены чалавек, які пілуе бервяно. Вышыня фігуркі чалавека складае 21,5 см. У руках трымае пілу даўжынёй 23 см. Фігурка, калі пацягнуць за прымацаваную да яе вяровачку, вагаецца, і ствараецца ўражанне пілавання. Цікава, што для супрацьвагі, у якасці грузіка майстрам-цацачнікам выкарыстана, паводле запісаў А.А. Мілера, «орудие каменного века» [7]. На гэтым жа прынцыпе заснаваны і іншыя цацкі парнага дзеяння: бараны б’юць ілбамі, працуюць кавалі, мужык з мядзведзем пілуюць бервяно і інш.

Значную трупу цацак з Беларусі ў РЭМе складае цацачны посуд. Можна назваць такія цацкі, сабраныя ў Магілёве, Гомелі і іх ваколіцах, як «самавар», «кубак», «талерка», «чайнік» [8]. Цацкі выраблены метадам тачэння. Вышыня самай вялікай цацкі не перавышае 3 см. Гульня дзіцяці з падобнымі цацкамі развівала каардынацыю рухаў, маторыку, дапамагала засвойваць назвы гаспадарчага посуду. Паўсюднае выкарыстанне дрэва як матэрыялу універсальнага, прыдатнага для будаўніцтва і для вырабу разнастайных прадметаў побыту, прылад працы, цацак, зрабіла прыёмы працы з дрэвам універсальнымі не толькі для тэрыторыі Беларусі, але і для ўсёй тэрыторыі Еўропы. Цацачнае мастацтва не з’яўляецца выключэннем. Для ўсіх рэгіёнаў Беларусі характэрны спадарожны характар гэтага віда мастацтва пры дрэваапрацоўчых рамествах.

Другім распаўсюджаным матэрыялам для вырабу цацак была гліна. У сваёй большасці гліняныя лялькі РЭМа адносяцца да кан. XIX - пач. XX ст., вось цацкі калекцыі № 10616 сабраны ўжо ў 80-х гадах XX ст. Паводле сюжэтаў і тэхнікі выканання цацкі дастаткова простыя і ўпісваюцца ў межы

традыцыйных сюжэтаў беларускай народный цацкі, гэта «гусар» - свістулька з чырвонай гліны, якая абпалена ў печы [9]. Уяўляе сабой вершніка ў шапцы на кані. Дэталі прадрапаны колатымі адтулінамі: два рады гузікаў на грудзях, конская збруя, вочы ў конніка і каня. Прадрапанымі рыскамі азначаны грыва каня і пер'е на шапцы конніка. У конніка есць некалькі бакавых адтулін - лады - і адтуліна ў хвасце свістулькі для ўдзьмування паветра. Мае вышыню 13 см і даўжыню 11 см. Цацка «кароль» - па стылістычнаму выкананню нагадвае «гусара». Уяўляе сабой вершніка на кані ў кароне. Памеры цацкі такія ж як і папярэдняй. Па стылістыцы, памерах і тэхніцы выканання падобныя цацкі «каралева», «польскі салдат», «вершнік» [10]. Цацкі зроблены знакамітым беларускім майстрам З.Л. Жылінскім з Ружанаў.

Асобную групу складаюць цацкі-выявы жывёл у калекцыі № 10616 («карова», «баран», «казёл», «сабака», «курачка», «пеўнік», «кураняты») [11]. Пералічаныя цацкі - гэта цацкі-свістулькі з чырвонай гліны, абпаленыя ў пячы, некаторыя з іх, як, напрыклад, «пеўнік» пакрытыя светла-зялёнай палівай. Драўляныя цацкі часцей за ўсё ўяўлялі сабой самаробныя механічныя кампазіцыі. Цацка «кураняты» прадстаўляе сабой драўляную самаробную цацку, якая складаецца з драўлянага кола з разной кароткай ручкай, на якой замацаваны 2 пеўніка і 10 курыц, зробленых з дрэва, прымацаваных да асновы вяровачкамі з драўляным яйкам на канцы. Пры пацягванні за яйка галовы курэй падымаюцца. Цацка размалявана чырвонымі, ружовымі і зялёнымі плямамі.

З дрэва ў калекцыі № 8761 зроблены «стралялка» - драўляная палачка, якая прыстасавана для стральбы гарохам, мае даўжыню 19 см; «яйка» - драўляная цацка, якая складаецца з дзвюх палавінак, афарбаваных у чырвоны колер; «труба» - цацка, вырабленая пастухамі [12]. Уяўляе сабой драўляную трубку з прамымі, пашыраючыміся на канцах сценкамі, якія абвіты бяростай, зроблена ў Магілёўскай губерні. Калекцыянер Н.І. Лебедзева ў 1930 г. дапоўніла дадзеную калекцыю «лукам» - драўлянай цацкай з Тураўскага раёна, вырабленай дзіцём з галінкі вярбы; «саначкамі» - цацкай з лучыны, якая мае даўжыню 13 см і шырыню 5,5 см, з Магілёўскай губерні. Падобныя цацкі калекцыі № 8761 - з фондаў былога Дзяржаўнага музея этнаграфіі народаў СССР [12]. Хацелася б асобна адзначытць некаторыя адзінкавыя цацкі з гэтай калекцыі. Гэта - «самавар» - драўляная тачоная цацка з Магілёўскай губерні, а таксама набор дзіцячага посуду з дрэва. Вышыня кубачкаў не перавышае 1,5 см, а дыяметр талерачак - 3,5 см.

Цікавымі таксама лічу цацкі з тканіны, відавочна вырабленыя самімі дзецьмі, іх у калекцыі ўсяго дзве. «Лялька» (6770-98) - з тканіны, апранутая ў спадніцу з паласатай тканіны, кашулю ў касую палоску і белы фартух з ружовымі палоскамі [13]. На галаве - зялёная хустка. Вышыня цацкі 17 см. «Лялька» (7583-75) - самаробная з кавалкаў тканіны блакітнага колеру, якая мае даўжыню 9 см. Гэтую ляльку збіральніку калекцыі І.І. Касцянец пад час экспедыцыі ўласнаручна вырабіла і падаравала дзяўчынка пяці год [14].

Значная колькасць цацак, якія знаходзяцца ў фондах Расійскага этнаграфічнага музея ў Санкт-Пецярбургу і паходзяць з Беларусі, сабрана вядомымі этнографамі кан. XIX - пач. XX ст., якія вывучалі Беларусь.

Так, у калекцыі № 515 утрымліваецца 11 цацак, набытых Е.Р. Раманавым у 1904 г. у Магілёўскай губерні Быхаўскага павета [15]. У калекцыі № 523 - 6 цацак з Магілёўскай губерні Магілёўскага павета [16]. У калекцыі № 524 - 4 цацкі, набытыя Е.Р. Раманавым у Магілёўскай губерні [17]. У калекцыі № 725 - 15 цацак, набытых Е.Р. Раманавым там жа [18]. Калекцыя № 941 была складзена ў 1906 г. А.К. Сержпутоўскім, які сабраў матэрыялы для яе ў 1905 г. пад час экспедыцыі ў Мінскую губерню. Цікавай дзіцячай цацкай з гэтай калекцыі з'яўляецца «стрэльба» з вёскі Вялікія Гарадзяцічы. Руля гэтай цацкі зроблена з медзі і прымацавана да драўлянай асады металічнай пласцінай і цвікамі. У «казённай» частцы стрэльбы зроблена дзірка, праз якую пры стрэле запаленай лучынай загараецца порах. Паводле прызначэння этнограф запісаў, што «гэты прадмет з'яўляецца цацкай і страляюць з яго дзеля таго толькі каб лужаць ваўкоў» [19]. Падобныя цацкі-самастрэлы сустракаюцца таксама ў калекцыі № 1292, сабранай А.А. Мілерам па даручэнні Этнаграфічнага аддзела Рускага Музея Імператара Аляксандра III у студзені-лютым 1908 г. у Магілёўскай губерні, у Чэрыкаўскім, Быхаўскім, Магілёўскім паветах. Гэта «ружжо» і «пісталет» (назвы дадзены паводле запісаў збіральніка) [20]. У гэтай жа калекцыі ёсць вельмі рэдкія для Беларусі цацкі «буркалка» - цацка, якая ўяўляе сабой кароткую свінную костку з прасвідраванай у сярэдзіне адтулінай, праз якую працягнута вяровачка з прывязанымі дзвюма драўлянымі ручкамі. Даўжыня косткі каля 6 см. Пры нацягванні вяровачкі цацка круціцца. Цацка «маска» - выраб з кардону ў якім зроблены прарэзы для вачэй і роту. Адтуліны для вачэй абшыты старой воўнай, на вусы і бараду выкарыстана таксама старая воўна. Нос зроблены з асобнага кавалку кардону. Маска пафарбавана ў цёмна-чырвоны колер. На вышыні вачэй з краёў прывязаны кавалак вяроўкі. Маска выраблена ў вёсцы Лабанаўка Чэрыкаўскага павета. Цікавы і «качкі» - дзіцячыя санкі для катания з горак. Яны складаюцца з двух

палазоў і чатырох круглых, папярэчных дошчачак. Даўжыня паміж палазамі - 35 см. Да пярэдняй перакладзіны прывязана вяроўка з драўлянай ручкай пасярэдзіне. У калекцыі № 1293, сабранай тым жа А.А. Мілерам у 1908 г., ёсць чатыры дзіцячыя цацкі з гліны, гэта «мядзведзь», «паня», «салдат» і «галкі» [21]. Шмат цацак, сабраных Расійскім этнаграфічным музеем, былі страчаны пад час Вялікай Айчыннай вайны, як напрыклад, цацкі калекцыі № 2542, якія датаваліся пачаткам XX ст., з калекцыі № 4046 - датаваліся кан. XIX - пач. XX ст., страчаны сем цацак з калекцыі № 3026, сабраных А.К. Сержпутоўскім у 1914 г. [22]. З гэтай калекцыі захаваліся чатыры цацкі: два гліняныя «конікі» і «птушка» з «салдацікам». З калекцыі № 4164, якая сабрана А.К. Сержпутоўскім у 1924 г. [23], выключаны чатыры цацкі. З захаваўшыхся цацак-экспанатаў наибольшую цікавасць выклікаюць «рёзанкі» - прадстаўляюць сабой 26 драўляных дошчачак-бірак па-рознаму нарэзаных. Цацка паходзіць з вёскі Жываглодавічы Слуцкага павета Мінскай губерні. Прылады для дзіцячых гульняў таксама можна аднесці да групы «цацак». Калекцыя № 4667 Расійскага этнаграфічнага музея, акрамя некалькіх лялек, змяшчае цікавыя прылады для гульняў. Гэта «стралялка», якую складаюць драўляная трубка, дыяметрам 2,5 см, з дыяметрам адтуліны 1 см і «кулі» - драўляныя палачкі даўжынёй 9 см - для стрэла. Цікавая цацка з калекцыі № 4164 - «лішкі», якая складаецца з 16 кавалачкаў кары і 4 фігур з кары, а таксама прылады для гульні «у мяч» (паводле А.К. Сержпутоўскага), гэта «мячык» - кавалак дрэва, «лапатка» - дошчачка даўжынёй 34 см для адбівання «мячыка». «Колышак», які мае даўжыню 16 см і ўбіваецца ў зямлю. Значную колькасць цацак утрымліваюць калекцыі № 5052 і № 5218, якія сабраны для Этнаграфічнага аддзела Рускага музея ў 1929 г., 1939 г. [24]. Калекцыя № 5052 сабрана А.К. Сержпутоўскім і ўтрымлівае 19 цацак, большасць з якіх гэта цацкі-выявы жывёлаў: пеўніка, курачкі, свінні, коніка, сабакі, ваўка, лісіцы і г.д. Цацкі зроблены з абпаленай гліны, некаторыя з іх пакрыты палівай. Цікава назва адной з цацак-выяў пеўніка, якую запісаў пры рэгістрацыі А.К. Сержпутоўскі - «пявун» [24]. У калекцыі № 5218, сабранай А.Я. Дунсбургам па даручэнню Этнаграфічнага аддзела Рускага музея, цікава драўляная «пагрэмушка», вытачаная на такарным станку. Яна мае форму яйка на доўгай ножцы, размалявана чырвонай і зялёнай палівай [25].

Асобную групу складаюць цацкі-героі батлейкі. Яны змешчаны ў асноўным у калекцыі № 2526, сабранай І.Е. Акімавым па даручэнні Этнаграфічнага аддзела Рускага Музея Імператара Аляксандар III у 1909 г. у Быхаўскім і Аршанскім паветах Магілёўскай губерні. Вось апісанне адной з такіх цацак пад нумарам 2526-2: «Анёл са свечкай - належыць батлейцы, хатняга вырабу з дрэва. Твар у анёла намаляваны ружовай фарбай, вочы зроблены з блакітнага бісеру, валасы - з пянькі, адзежа - з белай даматканай тканіны, грудзі і плечы абгорнуты «залатой» паперай, да плячэй прыклеена пер’е, якое павінна прадстаўляць крылы. У правай руцэ анёл трымае васкавую свечку. Фігурка змешчана на жалезны стрыжань з драўлянай ручкай» [26]. Паходзіць цацка з вёскі Быч Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. Падобна да «анёла» выкананы і астатнія з персанажаў батлейкі: Адам і Ева, пастушкі, тры цары, Ірад, Рахіль, ваяр са штыком, смерць, чорт, пан, цыган, цыганка, Міхаська - сын цыганкі, жыд Бэрка, Антон з казой, Антоніха, рускі ваяр і г.д. Лялькі для батлейкі выраблялся па тых жа правілах, што і звычайныя лялькі для дзіцячай гульні, аднак, дзеля большай дэкаратыўнасці і відовішчнасці, дапушчалася сумяшчэнне розных матэрыялаў: дрэва і тканіны, нітак і паперы, пер’я і гліны, што ў іншых відах народнай цацкі сустракаецца рэдка.

Цацкі з Беларусі Расійскага этнаграфічнага музея з’яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння культуры беларускага этнаса. Увядзенне ў навуковы абарот і вывучэнне этнаграфічных матэрыялаў, якія знаходзяцца ў музеях за межамі краіны, дазволіць больш дасканала даследаваць беларускія трацыйныя гульні і цацкі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пузыны-Усая / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. - Мн.: БелЭн, 2001. - С. 108.
2. Баранова И.И., Голькова Л.Ф. Материалы по детству и воспитанию в коллекциях ГМЭ народов СССР по русской этнографии // «Мир детства» в традиционной культуре народов СССР: Сб. науч. тр. / Ред. А.Б. Островский. - Л., 1991. - С. 5 -23.
3. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 515-12-22.
4. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 523-25.
5. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў -5218-61.
6. Материалы по этнографии белорусов в собрании Российского этнографического музея: Предметно-тематический каталог-указатель коллекций / Сост. О.В. Лысенко. - СПб., 1993. - 122 с.
7. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 1292-118.

8. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 4741 - 4744.
9. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 10616 - 10966-28.
10. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 10616 - 10966-28,29, 30, 31, 32.
11. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 10616 - 10966-33, 34, 35, 36, 37, 38.
12. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 8761-4747/Д-4751/Д.
13. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 6770-98.
14. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 7583-75.
15. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 515.
16. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 523.
17. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 524.
18. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 725.
19. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 941.
20. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 1292.
21. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 1293.
22. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 2542, 4046, 3026.
23. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 4164.
24. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 4667, 5052, 5218, 5052.
25. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 5218.
26. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў - 2526.